PolotskSU



УДК 392

# УПЛЫЎ САЦЫЯЛЬНЫХ СТЭРЭАТЫПАЎ ТРАДЫЦЫЙНАГА ГРАМАДСТВА НА ЛЁСЫ БЕЛАРУСКІХ ЖАНЧЫН XX СТ. – ПАЧ. XXI СТ. (ПАВОДЛЕ ЭТНАГРАФІЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ПАДЗВІННЯ)

*канд. гіст. навук, дац. С.У. АНДРЫЕЎСКАЯ*
Полацкі дзяржаўны універсітэт

*Разглядаюцца некаторыя сацыяльныя стэрэатыпы, якія існавалі ў традыцыйным грамадстве і перайшлі ў сучаснасць, прасочваецца іх уплыў на вобраз мыслення і паводзіны людзей у сітуацыі маральнага выбару, абранні жыццёвай стратэгіі, тлумачэнні асабістых матываў паводзін.Скарыстаны палявыя этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя аўтарам даследавання, якія захоўваюцца ў Архіве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.К. Крапівы Дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". Ажыццяўляецца спроба сінтэзу навуковых гуманітарных ведаў з розных абласцей (псіхалогіі і этналогіі). Пры аналізе эмпірычнага матэрыялу выкарыстоўваюцца метады гісторыі штодзённасці. Робяцца высновы пра ўплыў стэрэатыпаў традыцыйнага грамадства на сучасную штодзённасць.*

Тры чвэрці насельніцтва Беларусі ў 2017 годзе пражывала ў гарадах, у дакладных лічбах гэтая прапорцыя выглядае наступным чынам: 7400800 – гарадское насельніцтва, 2103900 – сельскае насельніцтва [1]. Аднак, стэрэатыпы традыцыйнага грамадства працягваюць уплываць на лад жыцця, уяўленні і паводзіны людзей.

У дадзеным артыкуле зроблена спроба прасачыць уплыў сацыяльных стэрэатыпаў, уласцівых для традыцыйнага грамадства, на лёсы жанчын XX ст. – пач. XXI ст. Падставай для выяўлення праблемы стаў аналіз тэкстаў успамінаў рэспандэнтаў.

Пры збіранні матэрыял, які прыналежыць да вобласці этнаграфіі дзяцінства, што з'яўлялася сферай навуковага інтарэсу аўтара на пэўным этапе, былі заўважаны наступныя асаблівасці, якія паказваюць якасныя характарыстыкі сабраных тэкстаў:

1. Рэспандэнты не абмяжоўваліся інфармацыяй, якая датычылася непасрэдна тэмы апытання, а разглядалі размову як магчымасць расказаць аб сваім уласным жыцці, нават паскардзіцца;

2. У ацэнках рэспандэнтаў свайго жыцця пераважае экстэрнальны локус кантроля жыцця (Локус кантроля асобы бывае экстернальным (знешнім) і інтэрнальным (унутраным) і паказвае, што мяркуе асоба аб кіраванні яго жыццём: знешнія сілы кіруюць, ці асабістыя якасці і памкненні).

3. Уяўны гендарны ўхіл інфармацыі у бок "жаночых" сфер інтарэсаў – выхаванне дзяцей, лёс, замужжа (што падцвярджаецца дэмаграфічная сітуацыяй для асоб сталага ўзросту: працягласць жыцця мужчын значна меншая);

PolotskSU



4. Імклівая змена сацыяльнай, дэмаграфічнай, культурнай сітуацыі ў грамадстве прывялі да таго, што стэрэатыпы традыцыйнага грамадства сталі больш супярэчыць сучаснаму ладу жыцця, што прывяло да іх большай рэльефнасці ў параўнанні з сучаснай паўсядзённасцю.

Тэма дадзенага артыкула знаходзіцца ў межах некалькі нетрадыцыйнага для гістарычнай навукі постсавецкай прасторы "гісторыі паўсядзённасці."

Па вызначэнні аднаго з пачынальнікаў гэтага напрамку, нямецкага даследчыка А. Людтке, гісторыя паўсядзённасці сканцэнтравана на аназізе ўчынкаў тых, каго называюць "маленькімі, простымі, радавымі людзьмі," на "дэталёвым аналізе іх душэўных перажыванняў, успамінаў, кахання і ненавісці, страхаў і надзей на будучае" [2, с. 46]

Паўсядзённасць – гэта звыклае, штодённае існаванне з усім, што акружае чалавека: яго бытам, асяроддзем, культурным фонам, моўнай лексікай. Усё гэта адыгрывае вялікую ролю ў фарміраванні характара чалавека.

Паўсядзённасць здаецца нам зразумелай не таму, што яна адрэфлексіравана, а таму, што яна звыклая і зразумелая. Па меркаванні прыхільнікаў тэорыі паўсядзённасці, задача даследчыка паказаць дыхатамію паміх аб'ектыўным, матэрыяльным, структурным (інстытуцыянальныя фактары) і суб'ектыўнымі, культурнымі, сімвалічнымі, эмацыянальнымі (чалавеымі фактарамі).

Гісторыю паўсядзённасці можна пазначыць, як міждысцыплінарную вобласць, у якой гісторыя разглядаецца як працэс жыцця асобнага чалавека.

Колькасць прааналізаваных тэкстаў-апісанняў жыцця рэспандэнтаў – 40. Перыяд збірання тэкстаў 2010 – 2018 гг. У большасці дата нараджэння прыходзіцца на 20-30 гады XX ст. (на сённяшні момант такім асобам 80-90 год), сярэдняя працягласць жыцця (на 2017 г.) у Беларусі складае: 74,3 гады (за апошнія 20 год працягласць жыцця павялічылася на 5,5 год, скарачаецца розніца паміж працягласцю жыцця жанчын і мужчын).

Прадметам даследавання стаў уплыў сацыяльных стэрэатыпаў традыцыйнага грамадства на лёсы беларускіх жанчын у азначаны гістарычны перыяд.

Асноўным паняццем у артыкуле выступае паняцце "сацыяльнага стэрэатыпа". Паняцце ўведзена у навуковы зварот у 20 г. XX ст. У. Ліпманам, добра распрацавана ў псіхалогіі і сацыялогіі.

Сацыяльны стэрэатып – гэта абагуленая, спрошчаная і рыгідная сістэма ўяўленняў аб асобных групах людзей, у якіх кожны чалавек выступае як носьбіт адных і тых жа якасцей і характарыстык, што прыпісваюцца любому прадстаўніку дадзенай групы без уліку яго рэальных якасцяў.

Асноўнымі якасцямі сацыяльнага стэрэатыпа, па меркаванні даследчыкаў, з'ўляюцца:

1) дрэнная распрацаваны кагнітыўны кампанент;

2) палярызаванась адзнакі (завышэнне адзнаі ідзе праз аўтастэрэатып, а заніжэнне – праз гетэрэастэрэатып);

3) жорсткая фіксаванасць стэрэатыпа, устойлівасць, якая праяўлецца ў розных сітуацыях;

4) інтэнсіўнасць эмацыйных праяў стэрэатыпа;

PolotskSU



5) канцэнтраванае выражэнне якасцей сацыяльных установак (стэрэатып - дакладны рэгулятар паводзінаў групы, асобы);

Г. Тэжфел вылучыў чатыры функцыі стэрэатыпаў, дзве з якіх рэалізуюцца на індывідуальным узроўні, а дзве – групавым.

На індывідуальным узроўні стэрэатып рэалізуецца праз:

1) Кагнітыўную функцыю (адбываецца селекцыя сацыяльнай інфармацыі, схематызацыя, спрачэнне.

2) Каштоўнасна-абарончая функцыя стварэнне і падтрыманне станоўчага "я-вобраза" асобы).

На узроўні групы стэрэатып рэалізуецца праз:

1) Ідэалігізуючую функцыю (фарміраванне і падтрыманне групавой ідэалогіі, якая растлумачвае і апраўдвае паводзіны групы);

2) падідэнцыфікацыйная ( стварэнне і падтрыманне групавога "мы-вобраза");

Г. Тэжфел сцвярджаў, што сацыяльнай псіхалогіяй, гісторыяй, культурнай антрапалогіяй і жыцейскім вопытам назапашаны багаты эмпірычны матэрыял, які сведчыць аб тым, што на ўзроўні групы сацыяльныя стэрэатыпы выконваюць указаныя функцыі [3, с. 16].

Нямецкі даследчык У. Квастгоф (U. Quasthoff) вылучыў наступныя функцыі стэрэатыпаў:

1) Кагнітыўная генералізацыя (адбываецца пры ўпарадкаванні інфармацыі, калі адзначаецца тое, што кідаецца адразу ў вочы).

2) Аффектыўная – пэўная мера этноцэнтрызма ў міжэтнічным ўзаемадзеянні, якая праяўляецца як вылучэнне "свайго" у процілегласць "чужому";

3) Сацыяльная – размежаванне ўнутрыгрупавога знешнегрупавому, што прыводзіць да ўтварэння сацыяльных структур, на якія актыўна абапіраюцца асобы ў паўсядзённым жыцці [4, с. 96].

Даследчык В.С. Агееў лічыць, што паколькі з'ява стэрэатыпізацыі прыцягнула ўвагу сацыёлагаў раней, чым псіхолагаў, гэта мела ўплыў на інтэрпрэтацыю функцый стэрэатыпаў, а непадзяленне сацыяльных і псіхалагічных функцый стэрэатыпаў, абумоўленае змяшэннем узроўнеў навуовага аналізу, прывяло да таго, што сацыяльныя стэрэатыпа ацэнены як адназначна негатыўныя [4, с. 95].

Існуюць розныя віды стэрэатыпаў. У прыватнасці, вылучаюць аўтастэрэатыпы, якія адлюстроўваюць уяўленні людзей аб саміх сабе. Гетэрастэрэатыпы, якія адлюстроўваюць уяўленні аб іншым народзе, сацыяльнай групе. Напрыклад, тое, што ў сваім народзе ўспрымаецца як праява беражлівасці, у прдстаўнікой іншага народа ўспрымаецца як праява сквапнасці. Больш прыватнымі лічацца стэрэатыпы этнічныя, гендэрныя, палітычныя і інш.

Таксама стэрэатыпы падзяляюцца на стэрэатыпы паводзінаў і стэрэатыпы свядомасці. Стэрэатыпы паводзінаў – гэта ўстойлівыя, рэгулярна паўтараючыяся паводзіны сацыякультурнай групы і тых індывідаў, якія да яе належаць. Яны моцна залежаць ад той сістэмы каштоўнасцей, якая ў дадзенай групе функцыянуе [4, с. 12].

Стэрэатыпа свядомаці – гэта фіксаваныя ідэальныя ўяўленні аб каштоўнасцна-нарматыўнай сістэме, якія выступаюць асновай для фарміравання стэрэатыпаў паводзінаў [5, с. 9].

PolotskSU



Стэрэатыпы свядомаці даюць мадэлі паводзінаў, а стэрэатыпы паводзінаў укараняюць гэтыя мадэлі ў паўсядзённае жыццё [6, с. 7].

Звернемся да прыкладаў з жыцця рэспандэнтаў. Найбольш часта сустракаемыя і лёгка дэкадыруемыя у тэкстах рэспандэнтаў гендарныя тэрэатыпы. Яны праяўляюцца праз меркаванні аб лёсе жанчыны, жаночых і мужчынскіх паводзінах і, нават, магчымасцях для маніпуляцый. Распавядае рэспандэнтка з в. Рудня Янкавічскага сельскага савета, 1932 г.н.:

*“Было мне 18 гадоў, як выйшла замуж. У мяне дзве дзевачкі і тры мальчыкі радзілася. Ён (мужык) хацеў, каб многа дзяцей было. Я, бачыш, за другога хацела, а мяне супраць волі за яго выдалі. Дык яму яго дзядзька сказаў, што калі многа дзяцей будзе, то я нікуды не дзенуся, з ім жыць буду. Дык і наражала дзяцей. Свадьба ў нас была аб адзін дзень*” [8, с. 31].

Тут мы бачым “стратэгію” захвання сям’і, уласцівую для жанчын. Многа дзяцей – нікуды не дзенешся, будзеш жыць. Дарэчы, гэтую стратэгію актыўна выкарыстоўвалі савецкія жанчыны, напрылад, как утрымаць мужчыну ў сям’і, ці каб “жаніўся”. У прыведзеным жа прыкладзе мы бачым, наадварот, такую стратэгію выкарыстоўваў мужчына (па парадзе сваёй маці). Вось яшчэ прыклад, калі дзеці разглядаліся, як магчымасць для кіравання паводзінамі дарослага члена сям’і:

*“Мужык быў дурны, раўнівы, нікуды мяне* ***адну не пускаў****. І дык я дзяцей не астаўляла. Брала з сабой у лес, бо адну не пускаў. Бывала іду сама і іх вяду чарніку сабіраць. Набярэм вядро, дамой нясём… Бывала, было многа чарнікі. А сёлята дык і чарнікі не было крэпка… Мала дужа яе…”*[8, с. 57].

Праяўляецца стэрэатып свядомаці – гэта фіксаваныя ідэальныя ўяўленні аб каштоўнасна-нарматыўнай сістэме – жаночыя каштоўнасці (выхаванне дзяцей, сям’я), мужчынскія каштоўнасці (уменне кіраваць сваім лёсам). Жанчына да старасці пражыла замужам за абранцам сваіх бацькой, нагадваю, размова ідзе не аб XIX ст., а аб сяр. XX ст., мясцовасці, у якой існавала савецкая ўлада. Вёска знаходзіцца недалёка ад г. Полацка.

У тэкстах рэспандаэнтаў утрымліваюцца звесткі аб прычыннай залежнасці “падпарадкавання лёсу”. Асноўная прычына, па меркаваннях рэспандэнтаў, – беднасць. “*А што мелі, тое і елі. “У катуху па быкавому петуху.” Нечага было есці! Галодныя хадзілі, не выбіралі, як цяпер! І бярэменная ўсё ела. Кажуць пазычаць нельзя, я пазычала. Калі нада, то і пазычыш. Кажуць на пахароны хадзіць нельзя, а як у хаце хто памрэ, куды дзенешся?”*[8, с. 32].

Праяўляюцца стэрэатыпы маслення жанчын і ў меркаваннях аб “не тыповых выпадках” з паўсядзённага жыцця:

*“Да бяздзетных адносіліся нармальна, але ў сварках, часам, успаміналі. Гэта сейчас ніхто ні з кім не ругаецца, ні да каго не ходзяць, сядзяць па сваіх вуглах. Сейчас бяздзетнасць не дзіва…*

*І ў мой час былі случаі, калі жэншчына ражалі і без свадьбы. У нас адна з канторы радзіла ад маладога мальца. А ёй было гадоў 35! Дык мы ёй падарак купілі, усёй канторай сабраліся. Усе да яе адносіліся добра. Такога не было, каб хто плоха атнасілся. А што цяпер. Дык ужэ не гледзяць. Многа такіх, што і без мужоў ражаюць*” [8, с. 36].

PolotskSU



Выкарыстанне ацэначных, эмацыйных рэакцый сведчыць аб тым, што дадзеныя тэмы для рэспандэнткі з'яўляюцца "актуальнымі," яны цікавяць асобу, што падцвярджае ускосна стэрэатып аб "жаночых" і "мужчынскіх" сферах у жыцці.

У межах традыцыйных уяўленняў аб невялікай вартасці чалавечага жыцця (асабліва, калі гэты дзіця) знаходзіцца выказванні рэспандэнтаў тыму:

*"Рабёнку загання адзежу не гатовяць (да нараджэння) а то памрэць. Тожа пустую калыску калыхаць нельзя, бо памрэць. Пялёнкі ў ноч стараліся не астаўляць, бо захварэе, у празнік, канешне, пялёнкі не шылі. Каб ноччу рабёнак не плакаў, брала да сябе ў ложак. Было і такое ў нас, што жанчына "прыспала рабёнка," задушыла ў ва сне. За гэта не судзілі"* [8, с. 56].

У межах стэрэатыпу аб "дапушчальным" і "недапушчальным" знаходзяцца разважанні рэспандэнтаў аб такой выключнай з'явы для традыцыйнага грамадства, як "бяздзетнасць" (рэспандэнтка 1940 г.н.):

*"Пра бяздзетную жанчыну у нас кажуць: "пустая." Але не ў вочы, а за спіной. У бяздзетнасці ёсць нейкая прычына: хто-небудзь з маладых вінаваты. Вось у мяне, напрыклад, у сына няма дзяцей, дык ён пражыў з нявесткай ужо 12 гадоў. У дзяцтве ён перабалеў свінкай. Ды і бяздзетнасць, пэўна, перадаецца ў раду. Дзядзька мой не меў дзяцей. Дык і сыну перадалося. Знаю прыкмету, якая сведчыць, што дзеўка скора выйдзець замуж: калі не замужам, а сніцца, што засцілаеш пасцель, гэта к замужжу"* [8, с. 36].

У прыведзеным выказванні рэспандэнті праяўляецца стэрэатып, характэрны дзя традыцыйнай культуры, аб тым, што маці адказна за фізічнае і духоўнае выхаванне сыноў. Так, напрылад, у традыцыйнай культуры існуюць шматлікія магічныя прыёмы, пры дапамозе якіх маці можа адняць мужчынскую сілу ў сына, яна ж кантралюе палавое жыццё сына [9, с. 205].

Разам з тым, што недапушчальна для жанчыны, дапушчальна (і прымальна) для мужчыны. Як мы бачым з цытаты, асаблівай бяды рэспандэнтка не бачыць у склаўшайся сітуацыі. Не цяжка ўявіць, што сказала б рэспандэнтка, каб у "бясплоднасці" пары была "вінавата" нявестка.

Шматдзетнасць, у некаторых выпадках успрымалася як стратэгія выжывання:

*"Бацька быў запашнікам. Зямлю меў. Пан* нас жалеў, што многа дзяцей: *даваў што з адзежы, ці вот, каляску даў... У пана быў Солтас (фамілія – Пётар Мутар), дык яго брат работаў чаляднікам, а мой бацька – запашнікам. Бацька тожа нас мэблю з лазы плёў і панам прадаваў: стулы, этажэркі там... Дзяцей у мяне няма. Тры разы выхадзіла замуж, з адным пражыла 11 гадоў – памёр, з другім 21 год – памёр, з трэцім 14 – памёр. Замуж выходзіла, маладая была саўсім... Можа, у 1953-м, ціху,... ужо не помню..."* [8, с. 53].

Мацярынства, паводле традыцыі, адлюстроўвае не толькі прызначэнне жанчыны, але і найбольш цесныя і трывалыя сувязі паміж людзьмі. Нярэдка мацярынскі доўг проціпастаўляецца асабістаму шчасцю, што відавочна з выказванняў рэспандэнтак: *"А вот яшчэ казалі, што я радзілася "ў сарочцы," ды такой крэпкай, што яе не маглі разрэзаць. У нас такое павер'е ёсьць, што калі рабёнак родзіцца ў сарочцы, то будзе шчаслівы. Нешта я асобенна гэтага не замеціла. Усе маме гаварылі, што твая дзевачка*

PolotskSU



*(значыць я) будзець шчаслівая. А хрэсьцілі мяне ў вайну. Ніякіх хрэсьбін не было. Я радзілася ў 1940 летам, а ў 1941 г. летам мяне хрысьцілі на даму ў сяашчэнніка. Айтец мой пагіб на вайне. Як ён пагіб,* ***я асталася адна ў мамы****, яна больш* ***замуж не выйшла і дзяцей больш не мела***” [8, с. 52].

Аднак, паколькі жыццё жанчыны вельмі залежыць ад выпадковых фактараў, і яна не можа рацыянальнымі сродкамі паўплываць на яго, лёс яе часта вызначаюць іншыя людзі, то традыцыя прапаноўвае цэлы арсенал магічных сродкаў і прыёмаў для забеспячэння шчаслівай долі: “*Я слышала, што еслі жэншчына нігде не была кумой, то яна будзе* ***нешчаслівая.*** *Па-гэтам жэншчыны стараюцца папасьці “ў кумы”, а пра мужыкоў такога не слышала.”* Дарэчы, у традыцыі беларусаў ёсць цэлы арсенал магічных сродкаў забеспячэння ўплыву на будучае сямейнае жыццё, найбольш часта яны выкарыстоўваюцца падчас вясельнага абраду: *“У царкве, калі маладыя трохкратна абходзяць алтар, маладая павінна непрыкметна наступіць на нагу жаніху, тады яна будзе ў сям’і верхаводзіць*” [8, с. 40].

Відавочна імкненне з дапамогай імянарачэння паўплываць на лёс дзіцяці. Называючы дзіяця імем сацыяльнапаспяховага чалавека, маці імкнуліся передаць такую ўласцівасць свайму дзіцяці:

*“У мужа майго цётка была з Ленінграда, дужа “крутая,” дык звалі Галей, дык муж мой і дачку хацеў назваць Галей”*.[8, с. 40].

У цэлым, паводле меркаванняў рэспандэнтак сталага ўзросту, дзеці успрымаліся з пункту гледжання “каб не перашкаджалі працаваць”. Рэдка хто з рэспандэнтак 20-30 г. нараджэння выказвалі клопат аб рознабаковым развіцці дзяцей. Лічылася, што задача бацькоў – забяспечыць матэрыяльны дастатак, а астатняе зробіць школа, грамадства:

*“Я як была бярэменная, мы завяліся там з адной, дык яна на мяне зямлёй кінула. А я дажэ не знала, што бярэменная. Мы з ёй тады буракі палолі. Дык пазней я бабе сваей расказала. А яна мне кажыць: “Гэта не добра, унучачка, мая!” Але я не замеціла нічога такога. Нармальная дзвачка была ў мяне. Якая дзяўчына первая была ўдачная!* ***Ніколі ёй нянька нада не была****. Сама, бывала, у бульбу ўвойдзець і ходзіць там сабе па агародзе, пакуль есьці не пазавуць*” [8, с. 43].

Замужжа успрымалася, як галоўнае, адзінае дасягненнне жанчыны, як падпарадкаванне лёсу. Цікавы і ўплыў, які аказала савецкая сістэма на светаўспрыманне асобы: “*Раней жа як:* ***плацілі “халасцяцкія”****. Калі не маеш дзяцей, то плаціш 150 рублёў, калі аднаго – палавіну, калі двух – меней, а калі трох – нічога не плаціш. Абортаў раней не рабілі. Як нада, то і раджалі. Я наражала 6-ць. А як жа ты думала… Во табе і планаванне. Як гэта планаваць?.. Каго першага хацелі? Было без разніцы. Як палучылася. Раньшэ ж замуж аддавалі: пасаг далі, карову, там, каня, зямлі… Ну, як бацькі дагаварываліся… Сяйчас нама дагавору бацькоў, а раньшэ бацькі дагаварываліся. Я свайго мужа не знала да свадьбы. Пажаніліся.* [8, с. 25].

Лічыцца, што працоўнае выхаванне – асноўны прыём і метад народнай педагогікі. Аднак, ва ўспрыманні рэспандэнтак разумовыя, інтэлектуальныя заняткі не адносяцца да працы. Калі размова ідзе аб працы, то гэта ў іх уяўленні абавязкова фізічная сельскагаспадарчая праца: “*Карову падаіць мне малой было інцерэсна… Маме я казала, што б мама не ішлаа даіць, а я сама з кружачкай даіла…Сем класаў я толькі закончыла, а болей не*

PolotskSU



*пайшла, бо палянілася. У нас начальная школа свая ёсць, а тады, далей в. Віркі такія ёсць, мы туды хадзілі… Гэта ў канец дзярэўні, як ідзеш на в. Кашчына… Бацька, як я кончыла сем класаў, бацька і заплаціў за школу. Нада было хадзіць у в. Гурэц, там такі далей быў…Я пахадзіла тры дні і… залянілася і болей не пайшла…* ***Дзеўцы нашто ж тая вучоба****. Тады ўжо работаць у калхоз пайшла… Началася трудавая жызнь… У мамы было пяць дзяцей, мы з братам удваіх асталіся. Астальныя памёрлі пасля вайны, ці ў вайну. Адзін ад залутахі памёр, другі яшчэ балеў. Асталіся мы адны з братам. Брат школу пазней канчаў. Папа ў 1982-м памёр, а мама ў 1989 г.*” [8, с. 48].

Пра падзел сельскагаспадарчай працы на мужчынскую і жаночую рэспандэнтка апавядае наступным чынам: “*Вот, пахаць, сеяць, касіць – гэта мужчынская работа. А вот пол памыць – гэта жэнская работа… Што я магла рабіла, то я рабіла… Вот палоць, садзіць, сціраць, карову даіць, есьці варыць – гэта, безуслоўна, бабская работа… У нашай сям’і мальчыкі большэ з бацькам, а дзяўчаты большэ з маткай… Матка з узрослымі дзеўчатамі мыла бяльё. А старшыя брацці з бацькам хадзілі касіць… Як каго прыжмець: бываець, і з 10 ходзіць з бацькам касіць, бываіць… Ніякіх прыказак пра работу я не знаю. Гэта вам нада на вечарынкі хадзіць у школу, там Вам і прыказкі і прымаўкі… А нам работаць нада было…”* [8, с. 94].

У межах стэрэатыпнага «дазволенага» разглядаецца ва ўспрыманні рэспандэнтаў і хатнія прыніжэнні жанчын: *“Пры матчыхі мы дзеці былі, што мы памагалі… Малыя яшчэ… Бацька ў лясу рабіў, дровы загатаўляў, каб нам было, нас жалеў. Прыйдзець, спрашаваець: “Ці абіжала матчаха вас?” Мы баяліся гаварыць, бо бацька тады яе біў… Спрашаваець: “А есьці ці давала?” А мы кажам: “А мы самі бралі і елі…” Мы баяліся гаварыць, бо тады ён яе б’ець… Еслі яна абіжала нас, то тады бацька яе біў. Тады была бойня. Мы жалелі яе…”* [8, с. 69]. Бацька рэспандэнткай разглядаецца як суддзя, якому дазволена выносіць пакаранні. Заўважым яшчэ раз: размова ідзе не аб сярэднявеччы, а аб 60–70 гг. ХХ ст.

Такім чынам, як бачым, стэрэатыпы традыцыйнага грамадства аказваюць моцны ўплыў на свядомасць рэспандэнтаў. Стэрэатыпы фарміруюць своеасаблівае светаўстпрыманне, у якім суіснуюць рэаліі сучаснай эпохі і традыцыйныя ўяўленні.

Жанчыны-рэспадэнткі, у большасці сваёй, успрымаюць уласнае жыццё як залежнае ад знешніх абставін і чужой волі. Відавочна, што традыцыйныя стэрэатыпы аказалі моцны ўплыў на фарміраванне іх лёсаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Соотношение сельского и городского населения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ont.by/news/our_news/sootnoshenie-selskogo-i-gorodskogo-naseleniya-podschital-departament-po-eko. – Дата доступа: 01.04.2018.
2. Людтке, А. История повседневности Германии: Новые подходы к изучению труда, войны и власти / А. Людтке. – М. : Издательство РОССПЭН, 2010. – 271 с.
3. Tajfel, H. Intergroup behavior // H. Tajfel, C. Fraser / Introducing social psychology. – N. Y. : Penguin Books, 1978. – P. 401 – 466.

PolotskSU



4. Агеев, В.С. Психологическое исследование социальных стереотипов / В.С. Агеев // Вопросы психологии. – 1990. – № 1. – С. 95–102.
5. Суходольская, Н.П. Социальный стереотип в жизнедеятельности людей : автореф. дис. … канд. филос. Наук : 09.00.11 / Н.П. Суходольская. – М., 2009. – 23 с.
6. Семендяева, О.Ю. Стереотип как социальный и социально-психологический феномен: (09.00.09) : автореф. дис. … канд. филос. наук / О.Ю. Семендяева ; АН СССР, Ин-т социол. исслед. – М., 1986. – 19 с.
7. Поповская, В.Б. Гендерный стереотип: особенности формирования и функционирования в языке и речи : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.19 / В.Б. Поповская. – Краснодар, 2007. – 26 с.
8. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Ф. 6. Воп. 13. Спр. 133. – 108 л.
9. Славянские древности: этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общей ред. Н.И. Толстого. – М. : Международные отношения, 2004. – Т. 3 : К (Круг) – П (Перепёлка). – 704 с.

## INFLUENCE OF SOCIAL STEREOTYPES OF TRADITIONAL SOCIETY ON THE FATE OF BELARUSIAN WOMEN OF THE XX CENTURY. - BEGINNING. XXI CT. (BASED ON THE ETHNOGRAPHIC MATERIALS OF DOVINA)

*S. ANDRYEUSKAJA*

*Some social stereotypes that existed in traditional society and passed into modern times are considered, their influence on the way of thinking and people behavior in the situation of moral choice, the choice of life strategy, the explanation of personal motives of behavior is traced. In the article are used field ethnographic materials collected by the author of the research and stored in the Archive of the Institute of Arts, Ethnography and Folklore named after KK. Krapiva of the State Scientific Institution "Center for Studies of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus". An attempt is made to synthesize scientific humanitarian knowledge from various fields (psychology and ethnology). The methods of empirical material analysis of the history of everyday life are used. Conclusions are drawn about the influence of stereotypes of traditional society on contemporary everyday life.*